# *Распрацоўка мерапрыемства, прысвечанага Дню роднай мовы*

*Дз.М.Чубрык,*
*А.М.Пляскач,*
*настаўнікі беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс*
*дзіцячы сад-сярэдняя школа"Карэліцкага раёна*

## *Гульня-спаборніцтва «Роднае слова ірвецца ў сэрца»*

**Мэты:** стварыць умовы для абагульнення ведаў вучняў, набытых пад час урокаў беларускай мовы і літаратуры; удасканалення навыкаў групавой работы; развіцця ў школьнікаў творчых здольнасцей, кемлівасці, артыстызму; выхавання любові да роднай мовы, цікавасці да моўнага багацця беларускага народа.

*У мерапрыемстве прымаюць удзел 2 каманды. Колькасць удзельнікаў адной каманды – 6 чалавек. Удзельнікі -вучні 5-6 класаў*

Лёсу майго кірунак,
долі маёй выснова,
як паратунак .-
матчына мова,
бацькава слова,
роднае вечнае слова!
*П.Макаль*

***Выходзіць чытальнік:***
Як ты дарага мне, мая родная мова!
Мілагучнае, звонкае, спеўнае слова!
Ты калісьці з калыскі мяне падымала
І вучыла ў бацькоў на руках гаварыць.
У жыцці маім слова найпершае "мама"
І цяпер для мяне сама міла гучыць.

***Вядучы.*** Гэтыя прыгожыя, звонкія радкі народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча прысвечаны нашай роднай мове. Мове, на якой размаўляем мы з вамі, мове нашых бацькоў і дзядоў, мове, гісторыя якой няпростая і цікавая.

Сення, 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Ён быў абвешчаны ЮНЕСКА 9 гадоў таму.

Сумная гісторыя ў гэтай даты. У 1952 годзе ў Бангладэш прымусова была ўведзена мова ўрду замест роднай мовы. Гэта выклікала пратэст насельніцтва. Падчас хваляванняў пяцёра студэнтаў былі застрэлены паліцыяй. Адбылося гэта ў 1959 годзе. Тыя 5 юнакоў ,што загінулі за сваю мову,сталі нацыянальнымі героямі - пакутнікамі. Цяпер мове бангла знікненне не пагражае. А ў 2000 годзе ЮНЕСКА абвясціла 21 лютага Міжнародным днём роднай мовы.

Родная мова шмат не патрабуе. Але калі ўжо назваў яе роднай, калі лічыць яе такой для сябе — павінен жа быць перад ёй хоць нейкі абавязак.

Нашы бацькі, дзяды і прадзеды нямала зрабілі, каб беларуская мова была прызнаная як роўная сярод іншых моў свету.

***Настаўнік.*** Сёння мы з вамі правядзём інтэлектуальную гульню-спабоніцтва, прысвечаную Міжнароднаму дню роднай мовы. Я спадзяюся, што мерапрыемства будзе садзейнічаць абагульненню ведаў, набытых пад час урокаў беларускай мовы і літаратуры; дапаможа раскрыць творчы патэнцыял кожнага вучня; будзе садзейнічаць выхаванню цікавасці да моўнага багацця беларускага народа.

Жадаю ўсім поспехаў!

***Вядучы.*** Вітаем удзельнікаў гульні, балельшчыкаў і шаноўнае журы!Сустракайце каманду "Гукі" і яе капітана Іну Коцік!
Запрашаецца каманда "Лічэбнікі" і яе капітан Паліна Чачотка!
Ёсць у нас і паважанае журы, якое будзе ацэньваць вашы адказы (прадстаўленне журы)

**1. Конкурс "Прывітанне"**

Журы павінна ацаніць ***эмблемы*** кожнай каманды і ***прывітанні.***

***Данута Бічэль "Роднае слова" , чытае Блашко Юлія***

**2.Конкурс "Слова трапнае і дасціпнае"**

Хто хутчэй запіша як мага больш азначэнняў, прыдатных для характарыстыкі слова. Якое яно бывае?
(Добрае,вясёлае,ласкавае,злое,беларускае,матчына.сяброўскае.суцешлівае…)

**3.Конкурс "Хто хутчэй?"**

Скорагаворкі напісаны на картачках, вам неабходна хутка, выразна прачытаць.
Ацэнка: не збіўся – пяць балаў, збіўся – два балы.

1.**Кроп у страве, страва на траве, трава на дварэ, дровы на дрывотні.**

2.**Падарыў Панкрат Карпу паркаль і шкарпэткі, паркаль пакралі, шкарпэткі парвалі**.

**4.Конкурс "Шукаем памылку!"**

Падкрэслі словы, дзе ёсць памылкі ў напісанні
Да ўрны, дачка Ульяна,першы раўнд,новае ток-шоу, каля універсітэта, новая саўна, паўднёва-усходні бераг, паехаць на сімпозіўм, маладая фраў, цікавая аўдыторыя

**5.Конкурс "Пазнай слова па значэнні"**

На дошцы вывешваюцца словы. Вучні выбіраюць 2 любыя з іх. Вядучы прапаноўвае заданне з выбранымі словамі. Калі ўдзельнікі не ведаюць, дапамагаюць гледачы.

Абрус, алей, вясёлка, аздобіць, раніца, прас

**6.Конкурс"Адгадай загадку"**

**(** выцягваем канверт з загадкамі **)**

1. Успомні насякомае адно,
   У слове месцам памяняй склады-
   І стану для цябе не навіной,

Бо на канверце мяне бачыш ты.

(Камар-марка)

2.Мы адносімся да мэблі,
А змяні парадак літар-
Нас на ногі ўжо надзелі,
Да вады пайшлі нібыта.

(Сталы-ласты)

**7. Конкурс “Паэтычная старонка”**

***Вядучы.*** Па апорных рыфмах напішыце верш. Другую страфу паспрабуйце прыдумаць самі.

| |
|---|
| *...........крышталікі,*<br>*............хмаркі ўгары,*<br>*............у белыя шалікі,*<br>*.......у белым бары.* |

Пасля конкурсу каманды (капітаны) агучваюць свае варыянты і аддаюць журы для азнаямлення і вызначэння пераможцы.

**8. <u>Конкурс балельшчыкаў</u>**

***Вядучы.*** Пакуль каманды прыдумваюць вершы, я прапаную віктарыну для балельшчыкаў. За правільны адказ – жэтон. Аб тым, дзе яго можна прымяніць, скажу пасля.

1) Якія літары ў беларускай мове заўсёды пад націскам? (о,ё).
2) Назавіце па два словы, у якіх гукаў больш, чым літар. (Ягады, салаўі, п’яўка, яблык).
3) Адгадайце загадкі:

- Якая вадзіца для граматнага гадзіцца? (Чарніла).
- У школьнай сумцы я ляжу, як ты вучышся, скажу. (Дзённік).
- Хто гаворыць на ўсіх мовах?(Язык).
- Які год цягнецца адзін дзень?(Новы год).
- Колькі гарошын увойдзе ў адну шклянку?(Ніводнай,бо гарох не мае ног).
- На што каню хамут кладуць?( На шыю).
- Чаму пастух пугу носіць?(Бо сама не ходзіць)

4) Назавіце два колеры, якія асабліва паважаюць беларусы. (Белы і чырвоны).
5) Як называюцца старажытныя народныя аповеды пра паходжанне свету, жыццё прыроды і чалавека? (Міфы).
6) Лірычны твор, пакладзены на музыку? (Песня).

***Вядучы.*** А зараз балельшчыкі аддадуць свае зробленыя ў конкурсе жэтоны камандам, якія яны падтрымліваюць. Тая каманда, якой падаруюць найбольшую колькасць жэтонаў, атрымае дадатковы бал ад журы.

***П.Броўка “Калі ласка”,чытае Ганчар Валерыя.***

**9.Конкурс “ Ці ўмеем мы вітацца па-беларуску”**

***Вядучы.*** Устаўце патрэбныя па сэнсе словы.
Выразна прачытайце верш В.Віткі.
(заданні ў канвертах)

Добра,калі ты змалку
Можаш вітаць людзей
Раніцай:”______________________”
І апоўдні: “_____________________”
Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць: “___________________”
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям:”_______________”

**10.Конкурс “Паштоўка з мінулага”(**канверт пад назвай “ Слова не верабей, вылеціць- не зловіш”).

***Вядучы.*** У мяне ёсць 2 канверты, аднак лістоў у іх няма. У кожным канверце- прыказкі пра мову,слова. Праўда, нейкі маленькі шкоднік пажартаваў і разрэзаў прыказкі напалам, а пасля яшчэ і ўсё пераблытаў. Але я думаю, для нас гэта не праблема.

Заданне: за 3 хвіліны ўзнавіць як мага больш беларускіх прыказак.

1. *Са свайго языка спусціш –/ на чужым не зловіш.*
2. *Слухай многа, /а гавары мала.*
3. *У добрую часіну сказаць,/ а ў ліхую прамаўчаць.*
4. *Дзе розумам не дайду, /дык у кніжцы знайду.*
5. *Не меўшы ў галаве,/ не кладзі на язык.*
6. *Які розум,/такая і гаворка.*
7. *Добрае слова / даражэйжае за грошы.*
8. *Рана загоіцца,/злое слова – ніколі.*
9. *Меней гавары,/болей пачуеш.*

**Падвядзенне вынікаў апошняга конкурсу і гульні. Узнагароджванне пераможцаў.**

***Вядучы.*** Любіце травы, дрэвы, рэкі,
Прастор палёў, блакіт нябёс,
Цаніце Працу,Чалавека,-
І Бог вам дасць спагадны лёс.

І каб цанілі вас ў свеце,-
(Я лепшых слоў не падбяру),-
Шануйце дзіва на планеце
Святую нашу Беларусь.

І мову Коласа, Купалы
Вы беражыце з роду ў род,
Каб наша воля не прапала,
Каб не загінуў наш народ!

*Алесь Ставер”Размова з нашчадкамі”*